Цэнтральны Камітэт КПСС заклікае вас, дарагія таварышы, грамадзяне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, аднадушна прагаласаваць за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных. Сваім галасаваннем вы зноў прадэманструеце вернасць справе Кастрычніка, справе партыі, рашучасць ажыццявіць прадвызначэнні XXV з'езда КПСС, імкненне жыць, працаваць і змагацца па-ленінску, па-камуністычнаму!

# УСЕ НА ВЫБАРЫ!

*(СА ЗВАРОТУ ЦК КПСС ДА ЎСІХ ВЫБАРШЧЫКАЎ, ГРАМАДЗЯН СССР).*


*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (1233) ● 1 сакавіка 1979 г. Цана 2 кап.




САРДЭЧНА ВІНШУЕМ З МІЖНАРОДНЫМ ЖАНОЧЫМ ДНЁМ 8 САКАВІКА!

ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ, ТВОРЧЫХ ПОСПЕХАЎ, ВЯЛІКАГА АСАБІСТАГА ШЧАСЦЯ ВАМ, ДАРАГІЯ ЖАНЧЫНЫ!

## ЗАКОН, ПА ЯКОМУ МЫ РОЎНЫЯ

**(Працяг. Пачатак у № 6 ад 22 лютага 1979 года).**

КАНСТЫТУЦЫЙНЫЯ прынцыпы выбараў у Вярхоўны Савет рэальна гарантаваны нашым грамадскім і дзяржаўным ладам. Іменна рэальнасць абвешчаных Канстытуцыяй правоў адрознівае становішча грамадзяніна ў сацыялістычнай дзяржаве.

Падобных гарантый не ведаюць капіталістычныя дзяржавы. Дзейнічаючыя ў гэтых краінах міжарытарная і прапарцыянальная выбарчыя сістэмы ў розных варыянтах абмяжоўваюць выбаршчыкаў у правах мноствам уловак і цэнзаў — маёмасным, расавым, аселасці, адукацыйным, узроставым і інш. Толькі ў ЗША існуе каля 50 розных абмежавальных цэнзаў. Гэта прыводзіць да таго, што больш паловы выбаршчыкаў не ўдзельнічаюць у выбарах. Шырока практыкуюцца подкупы галасоў, парушаецца тайна галасавання.

Кожная выбарчая кампанія ў буржуазных краінах — гэта жорсткая барацьба класаў, партый, рэлігій і іншых сацыяльных груп, у якой прагрэсіўныя партыі і сілы актыўна змагаюцца за свае правы. Выбраныя ў такіх антыдэмакратычных умовах парламенты прадстаўляюць толькі пануючы ў грамадстве клас капіталістаў.

На іншых, гуманных і сапраўды дэмакратычных прынцыпах, ствараецца і дзейнічае Вярхоўны Савет СССР. Ён пасапраўднаму прадстаўнічы орган усяго савецкага народа. Так, у Савеце Нацыянальнасцей, рабочыя і калгаснікі складаюць больш паловы дэпутатаў, жанчыны—амаль трэцюю частку.

Створаныя народам Саветы абапіраюцца на шматлікія грамадскія арганізацыі, сходы працоўных і актывістаў, чэрпаючы ў іх усё новыя творчыя сілы. Толькі да мясцовых Саветаў СССР прымыкаюць розныя самадзейныя арганізацыі, аб'ядноўваючыя звыш 31 млн. чалавек. У Беларускай ССР — 1,5 млн. чалавек.Такім чынам, амаль кожны другі дарослы грамадзянін нашай рэспублікі ўдзельнічае ў рабоце Саветаў. Гэта і ёсць, па вызначэнню У. І. Леніна, «той цудоўны сродак», які дае магчымасць «...адразу адным ударам удзесяцярыць наш дзяржаўны апарат, сродак, якога ніводная капіталістычная дзяржава ніколі не мела і мець не можа» (У. І. Ленін. ПЗТ, т. 34, стар. 313). У арт. 108 Канстытуцыі СССР замацоўваецца новае правіла аб тым, што законы СССР прымаюцца цяпер або Вярхоўным Саветам СССР на сесіях, або непасрэдна народам шляхам усенароднага галасавання (рэферэндума), які праводзіцца ла рашэнню Вярхоўнага Савета СССР.

Характэрнай асаблівасцю арганізацыі і правядзення выбараў у СССР з'яўляецца шырокае прыцягненне грамадзян. Толькі ў цэнтральных, акруговых і ўчастковых камісіях працуюць дзесяткі тысяч актывістаў. З дапамогай актывістаў складаюцца спісы выбаршчыкаў, арганізуюцца сустрэчы выбаршчыкаў з кандыдатамі ў дэпутаты, праводзіцца вялікая агітацыйна-масавая работа.

Дэмакратызм савецкай выбарчай сістэмы вынікае з сацыялістычных вытворчых адносін, з самой прыроды грамадскага і дзяржаўнага ладу, дзе няма прыватнай уласнасці, эксплуатацыі, нацыянальнага прыгнёту, дзе ўстаноўлена раўнапраўе класаў, нацый і народнасцей, мужчын і жанчын, дзе сапраўдным гаспадаром і актыўным удзельнікам грамадскага і дзяржаўнага жыцця з'яўляецца адзіны савецкі народ, кіруемы КПСС.

Толькі сацыялізм па-сапраўднаму прыцягвае масы да актыўнага палітычнага жыцця. Для савецкіх грамадзян выбары ў Саветы — гэта вялікае свята. Яны разглядаюць іх не толькі як рэалізацыю свайго выбарчага права, але і як доўг у выкананні сваёй палітычнай ролі ў агульнанароднай дзяржаве.

**А. ГАЛАЎКО,**
**доктар юрыдычных навук, прафесар.**

## Калі ўсміхаецца жанчына

Калі ўсміхаецца жанчына,
Што тоіцца ва ўсмешцы той,
Якая думка, і прычына,
І сэнс, і мара, і настрой?

Яна сама ці разумее,
А нам тым больш ці зразумець?
Ды нат гарластыя нямеюць,
Бо немагчыма не нямець.

І разумею я раўніўца,
Што ўспыхваў, нібыта агонь,
З-за ўсмешкі юнай чараўніцы,
Што бліскала не для яго.

І рыцара я разумею,
Які, адкрыўшы, як сезам,
Ізольду або Дульцынею,
Жыццём плаціў за ўсмешку дам.

Ды што з таго!..
Адно імгненне,—
І я ў бязведанні ўсяго:
Ты заўсміхалася таемна —
Чаму, каму, пашто, чаго?!

Хоць не раўнівец, а таксама
Душою адчуваю ў ёй
Ні то адчужанасці драму,
Ні то дрыготкі неспакой.

І хоць не рыцар, нібы рыцар,
І я ў паход гатоў трубіць,
Нідзе ні ў чым не пакарыцца,
Героем быць, адчайным быць.

Ісці-брысці ў пару любую
Гатоў на голад, холад, смерць
За ўсмешку гэтую, якую
Давеку нам не зразумець!..

Алег ЛОЙКА



## ПА БДУ
### Інфармацыя

На семінары сакратароў, намеснікаў сакратароў па ідэалагічнай рабоце і партгрупоргаў, які адбыўся ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна, выступіў загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Мінскага абкома КПБ Атрошчанка У. Д. Тэма яго выступлення — развіццё і далейшае ўдасканаленне народнай адукацыі ў Мінскай вобласці ў святле патрабаванняў XXV з'езда КПСС.

Выступаючы звярнуў увагу ўдзельнікаў семінара на важныя пытанні навучання і камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі ва універсітэце, на комплексны падыход да гэтай важнай справы. У. Д. Атрошчанка адзначыў, што выпускнікі універсітэта валодаюць глыбокімі і трывалымі ведамі, але часам ім не хапае метадычных навыкаў.

Аб ролі партыйнага бюро ў арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў расказаў прысутным старшыня савета універсітэта па грамадска-палітычнай практыцы, прарэктар па завочнаму і вячэрняму навучанню У. С. Багданаў.

Старшыня камісіі па наглядная агітацыі і насценнаму друку пры парткоме БДУ, прафесар С. С. Шушкевіч у сваім выступленні паведаміў аб выніках агляду-конкурсу насценнай агітацыі факультэтаў, які нядаўна завяршыўся, выказаў прапановы па павышэнню ідэйна-мастацкага ўзроўню нагляднай агітацыі, закрануў важныя пытанні ролі насценнага друку і нагляднай агітацыі ў выхаванні студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

На філалагічным факультэце прайшла канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага саставу па кнізе Л. І. Брэжнева «Цаліна». Канферэнцыю адкрыў прафесар кафедры беларускай літаратуры, кіраўнік філасофскага семінара літаратуразнаўцаў філфака Алег Антонавіч Лойка.

На канферэнцыі выступілі дэкан факультэта А. А. Волк, дацэнты В. П. Рагойша, С. А. Лысенка, М. Б. Яфімава, У. А. Навумовіч і іншыя.

**Л. АНДРЭЕВА.**

**Няма такой старонкі ў гісторыі нашай дзяржавы, на якой не былі б напісаны слаўныя жаночыя імёны. Жанчына нароўні з мужчынай адстойвала Савецкую ўладу ў гады грамадзянскай вайны, самааддана працавала на будоўлях першых пяцігодак. А калі грымнула Вялікая Айчынная вайна, стала на абарону любімай Бацькаўшчыны.**

**Сёння савецкія жанчыны працуюць на ўсіх участках камуністычнага будаўніцтва. Іх розум, талент і самааддансць дапамагаюць дабівацца выдатных перамог, памнажаць славу нашай любімай Радзімы.**

**Разам з усімі савецкімі жанчынамі паўнакроўным жыццём жывуць і жанчыны нашага універсітэта. Яны ўносяць вялікі ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў, у выхаванне падрастаючага пакалення.**

**З агульнай колькасці прафесарска - выкладчыцкага саставу Беларускага дзяржаўнага універсітэта амаль трэцюю частку складаюць жанчыны.**

**Дабіваюцца поспеху нашы жанчыны і ў навуцы. Аб гэтым сведчаць хаця б такія факты. Кожны дзевяты доктар навук ва універсітэце — жанчына, кожны трэці кандыдат навук — жанчына.**

Далёка за межамі Беларусі вядома імя прафесара, доктара юрыдычных навук Ізабэлы Іванаўны Марціновіч. Яна — буйны вучоны-юрыст. У 40 год Ізабэла Іванаўна абараніла доктарскую дысертацыю. У студзені 1978 года выйшла ў свет яе манаграфія «Грамадскія суды БССР у сацыялістычным будаўніцтве».

Выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта ведаюць Ізабэлу Іванаўну не толькі як буйнага вучонага, але і як грамадскага дзеяча. Яна член Камітэта савецкіх жанчын. У 1977 годзе, калі Фінляндыя адзначала 60-годдзе сваёй незалежнасці, Ізабэла Іванаўна была запрошана на свята Аддзяленнем сувязі дэмакратычнага саюза жанчын гэтай краіны. Яна прымала ўдзел у прэс-канферэнцыях, выступала перад працоўнымі і служачымі гарадоў Хельсінкі, Турку.



# НЯХАЙ ПЯЕ



## ЖЫЦЦЁ ПРЫГОЖАЕ, ЦІКАВАЕ, ЗАЙЗДРОСНАЕ

Інструктар ЦК камсамола Беларусі па рабоце камсамольскіх арганізацый у тыле ворага, яна ў 1942-43 гг. некалькі разоў пераходзіла лінію фронту, звязвалася з партызанскімі атрадамі і падпольнымі групамі ў Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай абласцях. А потым да канца вайны ўдзельнічала ў партызанскім руху ў Польшчы. Мае адзіннаццаць урадавых узнагарод...

Промні сонца зазірнулі ў невялікі ўтульны кабінет. Жанчына з пабялелымі валасамі ўсміхаецца з-за свайго стала. А мне ніяк не ўдаецца ўявіць у ролі партызанкі, камсамольскага дзеяча Таццяну Іванаўну Прытыцкую, загадчыцу кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, прафесара, доктара навук. Час пераўтварае людзей.

— Што яшчэ пра сябе расказаць? — паўтарае маё пытанне Таццяна Іванаўна. — Пасля вайны закончыла Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС у Маскве. Потым — партыйная работа ў Гродна, Маладзечна...

З 50-х гадоў Таццяна Іванаўна — супрацоўнік БДУ, з 1967 года ўзначальвае кафедру гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў. Шмат часу ўдзяляе навуковай рабоце. Яна — адзін з аўтараў падручніка «Курс лекцый па гісторыі КПСС». Манаграфія «Рэвалюцыйны шлях Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі» атрымала высокую ацэнку ў Польшчы і рыхтуецца да перавыдання на польскай мове. Зараз прафесар Т. І. Прытыцкая кіруе распрацоўкай комплекснай тэмы «Фарміраванне камуністычнай перакананасці і непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі ў працэсе выкладання гісторыі КПСС». У рабоце ўдзельнічаюць 19 дактароў і кандыдатаў навук. Акрамя супрацоўнікаў кафедры, прыцягнуты спецыялісты з інстытута павышэння кваліфікацыі, політэхнічнага, інстытута народнай гаспадаркі і вышэйшай партшколы. Адначасова Таццяна Іванаўна заканчвае манаграфію «Марксісцка - ленінскае вучэнне аб арганізацыйных прынцыпах Камуністычнай партыі і сучаснасць».

Як вядомы беларускі вучоны, Таццяна Іванаўна неаднаразова бывала за мяжой у саставе дэлегацый нашай краіны. У Іенскім і Люблянскім універсітэтах ёю былі прачытаны спецкурсы па гісторыі КПСС. Таццяна Іванаўна — член рэспубліканскага таварыства культурных сувязей з замежнымі краінамі.

— А я яшчэ і бабуля, — смяецца Таццяна Іванаўна. — Унук у мяне ўжо ў сёмым класе, унучка — у другім.

Пры ўпамінанні аб унуках яшчэ больш цяплее яе добры, уважлівы позірк.

Якім змястоўным можа быць чалавечае жыццё! Прыгожым. Цікавым. Непаўторным.

**Т. АБРАМОВІЧ.**

## ГАЛОЎНАЕ Ў ЧАЛАВЕКУ

Семнаццаць гадоў прайшло з тае пары, калі Фаіна Ціханаўна Бачук прыйшла на кафедру замежнай літаратуры.

Пасада лабаранткі? Ці аб ёй марыла новая супрацоўніца? Праўду кажучы—не. З самага дзяцінства яе вабіла праца школьнай настаўніцы. З яе трывогамі, рамантыкай, пошукам. Але жыццё распарадзілася інакш.

Пачынаць было цяжка. Не было адпаведнай матэрыяльнай базы, нават асобнага памяшкання кафедра не мела.

Зараз ужо цяжка ўспомніць, што было зроблена за прайшоўшыя гады. Утульны пакой цікава аформлен. Турботамі Фаіны Ціханаўны створан стэнд, які расказвае аб развіцці кафедры. У неабходнай колькасці ёсць вучэбная і дапаможная літаратура. Да патрэб выкладчыкаў і студэнтаў—падшыўкі газет і часопісаў.

Пачынаць было цяжка. Але Фаіна Ціханаўна на ўсіх этапах работы адчувала дапамогу і зацікаўленасць у сваёй працы загадчыка кафедры і яе супрацоўнікаў. І адчуванне таго, што яна тут патрэбна, нарэшце упэўніла яе, што сваё месца ў жыцці яна знайшла правільна.



Размаўляеш з ёю і здзіўляешся той зацікаўленасці, з якой яна расказвае аб сваёй рабоце, аб справах кафедры. Для Фаіны Ціханаўны ў жыцці кафедры няма дробязей.

А зараз прадаставім слова калегам лабаранткі.

Ірына Нічыпараўна Гусева:

— Фаіна Ціханаўна — добрасумленны працаўнік. Яна цалкам аддае сябе любімай справе.

Людміла Уладзіміраўна Хрышчановіч:

— Фаіна Ціханаўна вельмі добрасумленна працуе. Мяне падкупляе яе шчырасць, дабрата, праўдзівасць.

А хіба не гэта галоўнае ў чалавеку?

**С. АЛЯКСЕЕЎ.**



*Студэнткі з Польскай Народнай Рэспублікі Іаланта Міхалек, Барбара Асойца і Малгажата Краўчык навучаюцца на філалагічным факультэце БДУ. Яны актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці (дапамагалі арганізаваць і правесці вечары польска-савецкай і польска - германскай дружбы).*

*Удзел у грамадскім жыцці факультэта не перашкаджае дзяўчатам паспяхова займацца. Так, сваю першую студэнцкую сесію яны ўсе здалі на выдатна.*

*Фота М. Дубовіка.*



## ЖАНЧЫНА— ВЯЛІКАЕ СЛОВА

Женщина — великое слово. В ней чистота девушки, в ней самоотверженность подруги, в ней подвиг матери.

**Н. А. Некрасов.**

Высота культуры определяется отношением к женщине.

* * *

От любви к женщине родилось все прекрасное на земле.

* * *

Надо хорошо понять и помнить, что без женщины невозможно осуществление социализма.

**М. Горький.**

Женщина не только способна понять самопожертвование: она сама умеет пожертвовать собой.

**И. С. Тургенев.**

Отношение к женщине — тончайший измеритель чести, совести, порядочности, благородства, высокая школа воспитания чуткости.

**В. А. Сухомлинский.**

Нет ничего прелестней женщины, в которой принципиальность, несгибаемая, неподкупная, никак не выпячена, а также естественна, скромна и женственна, как и все, что бы эта женщина ни делала.

**А. А. Фадеев.**

Видеть и уважать в женщине человека — не только необходимое, но и главное условие возможности любви для порядочного человека нашего времени.

**В. Г. Белинский.**

# Дачка гераічнага В'етнама

В'етнамская студэнтка Нгуен Кім Ань вучыцца на V курсе ФПМ.

Цяпер у пяцікурснікаў вытворчая практыка. Адказны час праверкі тэарэтычных ведаў, канкрэтнае вырашэнне галоўнай задачы, да якой выкладчыкі і студэнты ішлі цэлыя пяць гадоў: ці навучыліся «размаўляць» з сучаснай тэхнікай «на роўных»? І, канешне, практыка — гэта непасрэднае дачыненне маладога спецыяліста да будучай працоўнай дзейнасці.

— Здаецца, атрымліваецца нядрэнна, — расказвае Нгуен Кім Ань. — І з работай, якую прыйдзецца выконваць у далейшым на вытворчасці, думаецца, спраўлюся паспяхова.

Усе падставы для гэтага ў Нгуен Кім Ань ёсць. Па-першае, веды ў яе трывалыя. А вялікае жаданне быць патрэбнай свайму народу дапаможа ёй рэалізаваць іх з найбольшай карысцю для радзімы. Па-другое, выбар будучай прафесіі не выпадковы. Шлях Нгуен Кім Ань да мары пачаўся яшчэ ў школе. І ўжо тады моцнае жаданне дзяўчыны вучыцца мела канкрэтную афарбоўку — стаць спецыялістам па ЭВМ. А такія спецыялісты сацыялістычнаму В'етнаму вельмі патрэбны. І гэта таксама Нгуен Кім Ань добра разумее.

— Многае, што я ўбачыла ў Савецкім Саюзе, — расказвае в'етнамская студэнтка, — застанецца надоўга са мной. І многае мае сэрца захавае назаўсёды.

Зусім нядаўна ў нашай групе адбыўся «Агеньчык». Мы гаварылі пра будучую работу, выказвалі адзін аднаму пажаданні... Зусім хутка мы развітаемся. І хоць я вельмі хачу на радзіму (у В'етнаме я не была пяць гадоў), тым больш, што цяпер такое цяжкае становішча там, але я ведаю: па Мінску, па нашых выкладчыках, па сябрах — буду сумаваць.

А ў заключэнне нашай размовы Нгуен Кім Ань сказала, што вельмі хоча, каб сумленная праца кожнага з яе аднакурснікаў стала агульнай жывой памяццю аб студэнцкім жыцці. Памяццю розуму і сэрца.

Ч. СЛАВІН.



# АБ ІХ КРАІНА

## ПОБАЧ ПЛЯЧО СЯБРОЎ

«Актыўны грамадскі работнік. Выдатна вучыцца. Добры таварыш» — такая характарыстыка дана аднакурснікамі Ганне Шэнкель — студэнтцы з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

Я сустрэўся з Ганнай і папрасіў расказаць крыху аб сабе.

— Тысяча дзевяцьсот семдзесят сёмы год для мяне быў удвайне радасным. Я стала кандыдатам у члены Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі. І прыехала вучыцца ў Савецкі Саюз, у Мінск.

Пачалося новае жыццё. Кожны дзень адбываліся новыя знаёмствы, сустрэчы. Цяпер многае забылася, але адно запомнілася надоўга: гэта добразычлівасць, сапраўдны інтарэс да яе лёсу, увага і клопат, якімі акружылі нямецкую студэнтку савецкія людзі.

Засталіся ззаду першыя ўражанні ад знаёмства з вялікай краінай, з яе людзьмі.

І вось цяпер Ганна — студэнтка II курса фізічнага факультэта.

Выбар факультэта не выпадковы. З дзяцінства прыцягвала яе тая майстэрня, у якой творыць свае цуды маці-прырода. І тут, на фізічным факультэце, яна яшчэ раз упэўнілася ў правільнасці зробленага выбару.

Вучобе Ганна аддае ўвесь свой час, таму, магчыма, па ўсіх прадметах у яе залікоўцы адна адзнака: «выдатна».



Студэнцкае жыццё бязмежнае і мнагапланавае. Надоўга застанецца ў памяці будаўнічы атрад, у якім яна працавала.

Першыя сустрэчы, знаёмствы з новымі людзьмі. Працавалі яны ў Малдавіі. І ўсюды, куды б ні закінуў лёс,—побач адчувала яна плячо сваіх новых сяброў.

Сакратар камсамольскай арганізацыі 7-й групы Юрый Літвіновіч так адзываецца аб Ганне:

— Шэнкель заўсёды імкнецца зразумець чалавека, а калі патрабуецца—дапамагчы.

Неяк разам са сваёй групай хадзіла Ганна ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Тое, што яна там убачыла, прымусіла яе па-новаму паглядзець на людзей, з якімі яна разам вучыцца, адпачывае, на народ, які столькі перажыў у час гэтай жудаснай вайны.

І зараз яна ва ўвесь голас гаворыць:

— Не—агрэсіі супраць В'етнама!

— Не—бязмежнаму гору маці!

— Не—несправядлівай вайне!

С. СІНІЛАЎ.

## ДЗЯКУЙ — ПА-РУСКУ

У Савецкі Саюз Каракура Ансіла прыехала з Бурундзі. Цяжка спачатку давалася ёй руская мова, але Каракура добра разумела, што калі не будзе з усёй адказнасцю адносіцца да яе вывучэння — не зможа добра авалодаць жаданай прафесіяй. Тым больш, што цікавасць да мовы, на якой размаўляў правадыр міжнароднага рэвалюцыйнага руху У. І. Ленін, была ўжо даўно.

— Дзякуючы дапамозе савецкіх студэнтаў, — дзеліцца сваімі думкамі Каракура, — мужу, які вучыцца ў аспірантуры, я цяпер размаўляю па-руску нядрэнна. Але цяжкасці яшчэ ёсць. У нашай школе была не вельмі моцная падрыхтоўка, і гэта я больш за ўсё адчуваю сёння.

Але Каракуры Ансіла яшчэ складаней было б авалодваць неабходнымі ведамі, каб не дапамога савецкіх сяброў. Самая блізкая з іх, гаворыць яна, гэта Таня Рэутава, аднакурсніца.

— Таня — добры, уважлівы таварыш. Калі я хварэла, яна неаднаразова прыходзіла да мяне. І не толькі дапамагала па вучобе, але імкнулася падтрымаць, падбадзёрыць.

Паўтара года назад у Каракуры Ансіла нарадзіўся сын. Маладая маці паказала некалькі фотаздымкаў, з якіх глядзеў хлопчык уважлівымі вачыма. «На бацьку глядзіць», — усміхнулася Каракура. І шчыра дадала: «Пра тое, як нас цёпла сустрэлі ў Савецкім Саюзе, пра маіх сяброў — ён будзе ведаць».

В. ЧУЧМАН.



# КАМІСАРША

Перш за ўсё ўвагу маю прыцягнулі чамусьці яе рукі. Іх адразу хацелася назваць надзейнымі. Адчувалася, што гэтыя дзявочыя далоні, шчырыя ў сяброўскім поціску, не падвядуць у рабоце, падтрымаюць у бядзе.

Ала Нежавец, чацвёртакурсніца механіка - матэматычнага факультэта, — камісар аднаго з лепшых факультэцкіх будаўнічых атрадаў «Расінка».



Камісар... Гэта званне традыцыйна асацыіруецца ў нас з вобразам непахіснага чалавека, здольнага ў любы момант павесці людзей за сабой. Але пры ўсёй сваёй прывабнасці такі вобраз — схематычны і аднабаковы. Камісар — абавязкова яшчэ і душа атрада, яго гонар, яго сумленне. Камісар не толькі кіраўнік, не толькі арганізатар, але яшчэ і шчыры, тактоўны сябар. Быць камісарам цяжка. Быць камісарам — талент. І асабліва калі ты — камісар жаночага атрада.

Размаўляю аб гэтым, пакуль Ала ўсхвалявана ўспамінае лета, расказвае аб атрадзе. Не, не аб сваёй ролі і рабоце ў ім — аб сябрах, аб працоўных днях, аб атрадных справах, аб радасцях і цяжкасцях, аб тым, як нараджаўся і складваўся, як вырас і ўзмужнеў калектыў «Расінкі». І вось па тым, як яна расказвае, як добра ведае кожнага свайго байца, па тых невялікіх і непрыкметных для чужога чалавека дэталях атраднага жыцця, якія, аднак, заўважыла і адзначыла Ала, разумееш, што яна сапраўды стала патрэбнай для кожнай з 47 дзяўчат, з якіх складваўся атрад. Незамянімай. А ці не ў гэтым прызванне камісара?

Сёння, далёка ад Слабадзейскага раёна Малдавіі, дзе ўжо пяць год запар кожнае лета старэйшы мехматаўскі атрад працуе на ўборцы ўраджаю, у дзяўчат з «Расінкі», звычайныя студэнцкія клопаты. І сярод іх — чаканне лета, калі зноў сустрэне іх знаёмае малдаўскае сяло, зноў будзе работа нязвыклая, часам нудная і цяжкая, але якая па-асабліваму здружыла іх, дапамагла атрымаць упэўненасць у сабе, паверыць у сяброў. Будуць цудоўныя вечары адпачынку, сустрэчы, паездкі па раёну, канцэрты агітбрыгады... Ды ці пералічыш усё, з чаго складаецца будатрадаўскае лета!

А ў камандзіра і камісара клопат больш канкрэтны. Конкурс у «Расінку» самы вялікі на факультэце. Трэба падабраць людзей, добра арганізаваць работу ў падрыхтоўчы перыяд, бо ад яе ў многім залежаць поспехі атрада. Планы, меркаванні. А колькі новых ідэй, новых думак!

— Ала, — пытаюся, — як табе ўдаецца сумяшчаць такую вялікую па аб'ёму атрадную работу з вучобай, з абавязкамі члена камітэта камсамола факультэта, нарэшце?

— Яшчэ і кнігі, і кіно, і тэатр. А раней — і спорт. У мяне другі дарослы разрад па лёгкай атлетыцы, — дадае Ала.— Ведаеце, урэшце заўсёды можна зрабіць так, каб паспяваць усюды. Усё залежыць ад самога сябе і людзей, якія побач. А мне шанцавала на цудоўных людзей.

І ўсё ж аб сабе Ала расказвае мала. Прыехала ў Мінск са Смілавіч адразу пасля школы. Чаму выбрала матэматыку? Цікавілася амаль аднолькава і ёю, і літаратурай, і хіміяй, але асаблівую любоў да матэматыкі здолеў прывіць школьны выкладчык.

— А чаму пайшла на мехмат, а не на ФПМ?

— Не магу ўявіць, як можна працаваць з машынамі. Для мяне галоўнае — людзі. Перспектыва — работа ў школе. А там неабходна добрае веданне людзей. Лепш пазнаць іх і сябе дапамог будатрад.

Т. САХАШЧЫК.

# Ці былі вы ў казцы?

Ці былі вы ў казцы? Так, у самай сапраўднай казцы? Не? А ці чулі вы легенды брэсцкага бору, ці прыслухоўваліся да таямнічага шуму велічных ёлак і соснаў? Спяшайцеся, ды не ў трыдзевятае царства, трыдзесятую дзяржаву, а ў дом адпачынку «Буг», што каля Жабінкі. Тут вас сустрэнуць цёпла і ветліва. Не былінны скамарох, а вясёлы масавік-забаўнік не дасць вам сумаваць ні хвіліны. Не лічыце, што ў вас няма ні да чаго здольнасцей. Будзеце самі здзіўляцца, адкуль узяўся ў вас талент танцора, спевака або дэкламатара, калі прымеце ўдзел у конкурсах, гульнях. А вось кіназала, заходзьце—і разам з мушкецёрамі вы змагаецеся за гонар дамы сэрца.

Прагаладаліся? Калі ласка, сталовая. Заказвайце, што вам падабаецца, і праз хвіліну — прыемнага апетыту.

Як наконт спорту? У вашым распараджэнні мясцовая турбаза. А заўтра вас чакаюць Брэсцкая крэпасць-герой і жыхары Белавежскай пушчы.

— «Буг» — інтэрнацыянальны студэнцкі дом адпачынку, — расказала Тоня Сяліцкая, студэнтка факультэта прыкладной матэматыкі БДУ. — Разам са мной там адпачывалі рабяты з Кубы, Панамы, Афрыкі, з ВНУ рэспублікі — БПІ, інстытута народнай гаспадаркі, педагагічнага, Брэсцкага архітэктурна-будаўнічага і інш. Кожны дзень новыя знаёмствы, сустрэчы. Паявілася шмат новых сяброў у кожнага. «Буг» здружыў нас.

А якія цудоўныя мясціны навокал! Здаецца, зімовая прырода стварыла цудоўныя замкі.

Калі вы не былі ў казцы, прыязджайце ў дом адпачынку «Буг».

А. РЫЖКЕВІЧ.
(Прэс-цэнтр прафкома).

*Напэўна няма такога студэнта, які пасля цяжкасцей і турбот чарговай сесіі не марыў бы аб канікулах. Канікулы — заслужаны адпачынак і кожны імкнецца правесці свабодныя ад вучобы дні з найбольшай цікавасцю і карысцю. Зімовыя канікулы — гэта і лыжныя паходы, і паездкі ў новыя мясціны, сустрэчы з цікавымі людзьмі і новыя знаёмствы на студэнцкіх базах адпачынку, гэта наведванне выставак і канцэртаў, гэта зімовы будаўнічы атрад, нарэшце. Але лепш аб сваіх толькі што прайшоўшых канікулах раскажуць самі студэнты.*

# ДОБРЫ ДЗЕНЬ, МАСКВА!

Калі мы даведаліся, што ў нас будуць канікулы, кожны думаў аб тым, што ён будзе рабіць у гэты час, дзе будзе адпачываць.

Спачатку я хацеў паехаць дадому, пабачыць сям'ю, сяброў, але калі даведаўся, што універсітэт арганізуе для нас, замежных студэнтаў, экскурсіі ў розныя гарады Савецкага Саюза, я вырашыў паехаць у Маскву.



Я ўжо быў у Маскве пяць месяцаў назад, калі прыехаў вучыцца ў СССР, але тады я не паспеў пазнаёміцца з горадам і адразу ж паехаў у Мінск.

І вось я зноў у Маскве. У нашай групе былі студэнты і аспіранты з Ірака, Гвінеі, Кубы, Егіпта, ГДР, В'етнама, Польшчы, Індыі, Руанды і СССР. Мы вельмі хутка пасябравалі, шмат расказвалі адзін аднаму пра свае краіны. Паездка была вельмі вясёлая і цікавая.

За пяць дзён, якія мы правялі ў Маскве, мы пазнаёміліся з горадам, яго славутасцямі. На ВДНГ мы доўга аглядалі павільён «Космас». І з асаблівай цікавасцю кожны з нас глядзеў на касмічны карабель «Усход», на якім першы касманаўт свету Ю. А. Гагарын падняўся ў космас.

На выстаўцы мы пазнаёміліся з дасягненнямі СССР у галіне цяжкай прамысловасці, у галіне сельскай гаспадаркі, навукі і культуры.

У час экскурсіі па гораду мы падняліся на Ленінскія горы. Стоячы ля помніка М. В. Ламаносаву, я ўспомніў усё, што даведаўся аб гэтым вялікім рускім вучоным на ўроках рускай мовы: як вялікае жаданне вучыцца прывяло хлопчыка з паўночнай вёскі ў Маскву, куды ён пайшоў пешшу, як потым А. С. Пушкін назваў Ламаносава за яго энцыклапедычныя веды «першым рускім універсітэтам».

Я з вялікім задавальненнем блукаў па цудоўных маскоўскіх праспектах і плошчах, захапляўся непаўторнымі па хараству станцыямі метро.

Але самае моцнае ўражанне пакінулі Красная плошча, Маскоўскі Крэмль і Маўзалей У. І. Леніна, стваральніка Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы. Савецкі народ і ўсе прагрэсіўныя людзі на зямлі свята захоўваюць памяць аб правадыру пралетарыяту. Вось чаму тысячы людзей з розных канцоў СССР і з іншых краін кожны дзень прыходзяць да Маўзалея У. І. Леніна. У мяне няма слоў, каб перадаць усе свае пачуцці. Але я магу сказаць, што тут павінен пабываць кожны сумленны чалавек.

У апошні дзень знаходжання ў Маскве мы наведалі Траццякоўскую галерэю, дзе пазнаёміліся з работамі многіх вядомых рускіх мастакоў.

Непрыкметна праляцелі гэтыя 5 дзён. Мы крыху стаміліся, але былі вельмі задаволены, што пазнаёміліся з Масквой, убачылі Вялікі тэатр і Барадзінскую панараму, пабывалі ў Крамлі.

Цяпер мы з задавальненнем дзелімся сваімі ўражаннямі з нашымі сябрамі, якія ў час канікулаў ездзілі ў Ленінград, Кіеў і Адэсу.

**НУР-ЕДДЗІН БЕНУАР,**
**стажор факультэта прыкладной матэматыкі.**

На здымку: у час паездкі ў Маскву.

Фота **У. Будая.**

# На лыжні

**Чатыры групы студэнтаў-хімікаў у час зімовых канікулаў сталі ўдзельнікамі турысцкіх паходаў па Беларусі і Прыбалтыцы.**

**Са студэнтамі, якія зацікавіліся Эстоніяй, я і пазнаёмілася. Іх пяцёра —няўрымслівых, вясёлых, вынаходлівых.**

**— Самае галоўнае, — гаворыць ініцыятар паходу Пеця Граковіч, — гэта выбар маршруту. Каб ён быў цікавым і змястоўным, давялося звяртацца да гісторыі і геаграфіі, прагледзець шмат кніг і газетных падшывак. Кожны стараўся ўнесці свой уклад у распрацоўку маршруту. Пяць пар вачэй дасканала вывучалі карту.**

**У час абмеркавання і зацвярджэння плана паходу варта было прыслухацца да голасу Уладзіміра Бяляцкага. Чацвёрты год ён ва універсітэце, і за яго плячыма ўдзел у дзевяці паходах.**

**Маршрут: Вільнюс—Нарва — Чудское возера. Ад Вільнюса да Нарвы 105 км прайшлі на лыжах за 8 дзён. Нарва з яе старажытнымі пабудовамі пакінула асабліва цікавыя ўспаміны. Уразіў сваёй прыгажосцю прамысловы горад Іыяві. Вельмі спадабаліся непаўторныя пейзажы эстонскай зімы. Аб цікавых мясцінах многа расказвалі мясцовыя жыхары.**

**Не адну лыжню праклалі студэнты...**

**Прывал. З плеч спаўзае запярушаны снегам рукзак. Падзяліцца ўражаннямі імкнуліся адразу. Пасля ежы, смачна прыгатаванай Люсяй Макавіцкай і Тоняй Шыдлоўскай, хутка праходзіць стома. І зноў лыжня кліча наперад да новых мясцін, сустрэч, адкрыццяў.**

**А. АЎРУСЕВІЧ.**



# Канікулы на будпляцоўцы

Бадай, ніхто з нас не падазраваў, што за два тыдні канікулаў можна зрабіць так многа. Нават бясстрасныя лічбы з камандзірскай справаздачы ўражваюць: «За час работы зімовага камуністычнага СБА імя Ленінскага камсамола на аб'ектах БМУ «Мінскрадыёбуд» асвоена 8,5 тысячы рублёў капіталаўкладанняў, байцамі атрада прачытана 25 лекцый, 3 канцэрты дала атраданая агітбрыгада».

За лічбамі — галоўнае, што прынеслі нам зімовыя канікулы. Нарадзіўся наш будатрад. Нарадзіўся не на паперы, не ў зацверджаным камітэтам камсамола спісе байцоў. Нарадзіўся ў справе.

Летні працоўны семестр мы правядзём на БАМе. Думаю, там, сярод сопак Якуціі, не раз успомнім мы гэтыя лютаўскія дні. І тое, як, пераадольваючы жаданне спусціцца ў цёплую бытоўку, далей ад пранізлівага ветру і марозу, узводзілі перагародкі каменшчыкі з брыгады Мішы Курылы. І «алімпійскія» вахты бетоншчыкаў з брыгады Валодзі Дзюбы, якая працавала на рэканструкцыі стадыёна «Дынама». І новы цэх завода імя Вавілава, ва ўзвядзенні якога ёсць доля працы рабят з брыгады Пятра Лістраценкі.

У атрад накіравалі сваіх прадстаўнікоў сем факультэтаў універсітэта. Людзі сабраліся розныя, незнаёмыя. Вось чаму так неабходна была адразу гэтая зімовая праверка. Цяпер не прыйдзецца штабу ламаць галаву, фарміруючы брыгады, вырашаючы, каму даверыць самыя адказныя ўчасткі работы. Таленты ўжо раскрыліся: лепшы сталяр атрада — Анатоль Дамарад, лепшы каменшчык— Павел Друз, лепшы бетоншчык — Саша Сяргееў.

Адкрыцці працягваліся і пасля работы. Іх прыносіў кожны вечар. Невычэрпны на выдумкі Алег Марозаў узначаліў агітбрыгаду (у яе ўвайшлі, дарэчы, усе байцы атрада). Першыя трэніроўкі правяла на снезе футбольная зборная. Атрадныя лектары падрыхтавалі лекцыі, з якімі выступалі перад рабочымі прама на будпляцоўках, у заводскіх цэхах. Усе жыхары інтэрната № 6, дзе жыў атрад, сталі слухачамі атраднай радыёгазеты, гледачамі і ўдзельнікамі арганізаванага намі конкурсу студэнцкай песні, сустрэчы з доктарам біялагічных навук прафесарам А. А. Логінавым. Студэнты-завочнікі былі частымі гасцямі нашага кансультацыйнага пункта. А самымі, бадай, прыемнымі для атрада былі вечары ўспамінаў тых байцоў, каму ўжо давялося працаваць на БАМе. Падоўгу ўглядваліся мы ў слайды і фотаздымкі з калекцыі нашага камандзіра Уладзіміра Карагіна — знаёміліся з мясцінамі, якія вабяць да сябе такімі знаёмымі і захапляючымі назвамі: Тында, Залацінка, Беркакіт, Сярэбраны Бор.

А раніцай зноў выходзілі на будпляцоўкі — узводзіць сцены, устанаўліваць апалубку, укладваць бетон. Бетон не толькі ў апоры будучых спартыўных збудаванняў, бетон — у фундамент нашага бамаўскага атрада.

**С. НОВІКАЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

На здымку: баец зімовага СБА А. Марозаў.

Фота **М. Бабія.**

У слухачоў падрыхтоўчага аддзялення філалагічнага факультэта і факультэта журналістыкі стала ўжо добрай традыцыяй у працэсе вывучэння твораў класікаў беларускай літаратуры наведваць музеі і выстаўкі, звязаныя з імёнамі праслаўленых дзеячаў беларускай культуры, бліжэй знаёміцца з іх жыццём і творчасцю. Цяперашнія слухачы падрыхтоўчага аддзялення вырашылі пашыраць і ўмацоўваць гэту традыцыю.

У хуткім будучым для рабят запланавана паездка на радзіму Я. Коласа, мемарыяльны комплекс Я. Купалы ў вёсцы Вязынка і ў іншыя цікавыя месцы. Адбудуцца сустрэчы з сучаснымі беларускімі пісьменнікамі і паэтамі ў Доме літаратара, дзе слухачы падрыхтоўчага аддзялення сталі ўжо жаданымі гасцямі. Усе гэтыя сустрэчы прынясуць вялікую карысць у пазнанні новага аб развіцці беларускай літаратуры.

Нядаўна будучыя філолагі і журналісты наведалі Дом-музей Янкі Купалы. Надоўга застанецца ў іх памяці цікавы расказ экскурсавода аб жыцці і творчасці беларускага песняра. Шмат чаго новага даведаліся слухачы пасля гэтай экскурсіі аб той тытанічнай працы дзеля славы свайго народа і Радзімы, якая прынесла сусветную вядомасць простаму беларускаму чалавеку, такому блізкаму і роднаму сэрцу кожнага сапраўднага грамадзяніна нашай краіны.



**А. ДАБРЫЯН,**
**слухач падрыхтоўчага аддзялення.**

**На здымку:** у час экскурсіі ў Дом-музей Я. Купалы.

Фота аўтара.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС

220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.